Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі ЎНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА і ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА імя У. І. ЛЕНІНА

№ 2 (590) Субота, 23 студзеня 1965 г. Год выдання XVIII-ы Цана 1 кап.

## ГОСЦІ СТУДЭНТАЎ

*Днём 14 студзеня госцем прафесарска-выкладчыцкага калектыву і студэнтаў нашага універсітэта быў Лаўрэат Ленінскай прэміі, народны артыст СССР А. І. Хачатуран. Арам Ільіч расказаў пра сваю творчую работу, а потым прапанаваў паслухаць некалькі напісаных ім твораў. У канцэрце, што адбыўся ў актавай зале, прынялі ўдзел Дзяржаўны сімфанічны аркестр БССР, студэнцкі хор Белдзяржкансерваторыі, вялікая група гасцей — артыстаў сталічных мастацкіх калектываў.*

*Выступленне віднага дзеяча савецкага Тэатра лялек лаўрэата Дзяржаўнай прэміі народнага артыста СССР С. Абразцова таксама праходзіла ў актавай зале універсітэта. Цікавы расказ С. Абразцова аб сваім творчым шляху суправаджаўся паказам асобных мініяцюр і сцэнак з лялькамі.*

## НАСЦЕННЫ ДРУК І ВУЧОБА

УНІВЕРСІТЭТ—адна з буйнейшых вышэйшых школ Беларусі. На адных толькі дзённых аддзяленнях тут вучыцца за чатыры тысячы студэнтаў. Чым і як жывуць гэтыя людзі? Ёсць розныя шляхі адлюстравання іх жыцця і вучобы. Адзін з важнейшых — насценны друк.

Амаль кожны факультэт (выключаючы вячэрні і завочны) мае сваю насценную газету. Мне давялося прагледзець не толькі апошнія, але і многія папярэднія нумары факультэцкіх насценных газет. Прыемна адзначыць, што многія з іх добра асвятляюць вучобу, пытанні камсамольскага жыцця груп і курсаў, пытанні быту і адпачынку студэнтаў у інтэрнатах, грамадскае жыццё сваіх калектываў. Але самым важным з'яўляецца тое, што кожнае выступленне газеты прысвечана галоўнаму ў студэнцкім жыцці — вучобе.

Вельмі добрае ўражанне пакідае насценная газета біялагічнага факультэта «За мічурынскую біялогію». Семнаццаты год выходзіць яна на факультэце. Гэта адна з самых старых насценных газет універсітэта. І самая аўтарытэтная. З году ў год яна займае першае месца сярод сваіх сяброўак на універсітэцкіх аглядах насценных газет. У чым сакрэт поспеху «мічурынкі», як ласкава называюць газету на біялагічным факультэце? Перш за ўсе, у самай цеснай сувязі з жыццём і вучобай студэнтаў. Гэта адна з лепшых традыцый газеты. Не менш важна і тое, што работай рэдакцыйнай калегіі пастаянна цікавяцца партыйная і камсамольская арганізацыі, кіраўнікі факультэта. У склад рэдкалегіі ўваходзяць не толькі студэнты, але і аспіранты і выкладчыкі. З нумару ў нумар расце прафесіянальнае майстэрства і газеты, і яе супрацоўнікаў. Газета мае некалькі аддзелаў, вядуцца пастаянныя рубрыкі, куток гумару і сатыры. Газета «За мічурынскую біялогію» па-сапраўднаму цікавіцца жыццём і вучобай не толькі студэнтаў стацыянара, але і студэнтаў вячэрняга аддзялення.

У рабоце газета біяфака практыкуе і тое, што часам не сустрэнеш у іншых газетах: змяшчаюцца водгукі па слядах выступленняў, робіцца ўсё для таго, каб кожны матэрыял ці выступленне быў мэтанакіраваным і рабіў уплыў на грамадскае жыццё факультэта. Не дзіўна, што некаторыя выступленні насценнай газеты «За мічурынскую біялогію» перадрукоўваліся рэспубліканскімі газетамі і нават часопісам «Рабоче-крестьянский корреспондент».

Нядрэнна працуюць рэдакцыйныя калегіі насценных газет філалагічнага («Голас філолага»), гістарычнага («Гісторык»), фізічнага («За навуку») факультэтаў. Фізікі, напрыклад, практыкуюць выпуск дадаткаў, курсавых і групавых насценных газет.

Вялікія нараканні выклікае работа насценных газет «Географ» і «Хімік». Дзеля справядлівасці трэба адзначыць, што ідэйна і па змесце «Географ» стаіць вышэй за «Хіміка». Асноўны недахоп газеты геаграфічнага факультэта — адсутнасць належнай увагі і дапамогі з боку факультэцкага камсамольскага бюро і іншых грамадскіх арганізацый факультэта. У размове з членамі рэдкалегіі «Географа» высветлілася, што матэрыялы ў чарговы нумар газеты збірае звычайна сам рэдактар. Ходзіць па факультэце і «выбівае» з кожнага, хто трапіцца на вочы, па некалькі радкоў. Трэба аддаць належнае, усё ж матэрыялы гэтай насценгазеты прынцыповыя, хоць і не заўсёды дасягаюць мэты.

У рабоце рэдакцыйнай калегіі «Хіміка» страчана тое зярнятка, што называецца факультэцкім гонарам. Абыякава і беспрынцыпова падрыхтаваныя матэрыялы і вельмі непрыглядны вонкавы выгляд не толькі не прыцягваюць увагі чытачоў, а нават адштурхоўваюць іх, пакідаючы непрыемны ўспамін. Выйсце адно: грамадскім арганізацыям, кіраўнікам хімфака, актывістам факультэта неабходна тэрмінова звярнуць увагу на сваю газету. І пачынаць трэба з самага пачатку. Трэба пазнаёміцца з вопытам работы іншых факультэцкіх газет.

Дарэчы, апошнім не можа пахваліцца ні адна рэдкалегія факультэцкай насценнай газеты. Вядома, што спаборнічаць — значыць, вучыцца адзін у аднаго. Гонар кожнай газеце, калі яна змагаецца за свой аўтарытэт сярод чытачоў, за павагу да сябе, за ўзмацненне сувязі з чытачамі.

Штогод ва універсітэце праводзіцца традыцыйны агляд факультэцкіх насценных газет. Мінулагодні агляд выявіў шмат недахопаў. Многія газеты ўлічылі і выправілі недахопы. Грамадскія арганізацыі і асабліва факультэцкія камсамольскія бюро тых факультэтаў, дзе справы з насценным друкам яшчэ дрэнныя, [...]інны тэрмінова выпраўляць становішча.

А. ЯРОХІН,
член камітэта камсамола універсітэта.

## ЛЕКТОРЫЙ БДУ
### наладжвае цыкл лекцый «Новае ў даследаваннях савецкіх гісторыкаў»

29 студзеня — «Асноўныя этапы развіцця савецкага грамадства». Лектар — доктар гістарычных навук І. Б. Берхін.

26 лютага — «Метадалагічныя праблемы марксісцка - ленінскай гістарычнай навукі». Лектар — загадчык сектара метадалогіі Інстытута гісторыі АН СССР М. Я. Гефтэр.

12 сакавіка — «Новае ў даследаваннях Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі». Лектар — доктар гістарычных навук Г. Н. Голікаў.

26 сакавіка — «Савецкія гісторыкі аб асаблівасцях імперыялізму ў Расіі». Лектар — ст. навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі АН СССР К. Н. Тарноўскі.

9 красавіка — «Асвятленне гісторыі Вялікай Айчыннай вайны 1941 —1945 гг. у новых даследаваннях гісторыкаў». Лектар — доктар гістарычных навук А. В. Карасёў.

23 красавіка — «Этапы развіцця культуры ў Расіі, іх асаблівасці і ўзаемасувязь». Лектар — акадэмік М. В. Нечкіна.

14 мая — «Вывучэнне гісторыі савецкага грамадства ў святле рашэнняў XX і XXII з'ездаў КПСС (гістарыяграфічны агляд)». Лектар — ст. навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі АН СССР Ю. С. Барысаў.

28 мая — «Міжнародны рабочы і камуністычны рух на сучасным этапе». Лектар — кандыдат гістарычных навук М. І. Міхайлаў.

11 чэрвеня — «Важнейшыя кірункі навуковых даследванняў у галіне гісторыі Беларусі». Лектар—член-карэспандэнт АН БССР Н. В. Каменская.

## ПІСЬМЫ Ў РЭДАКЦЫЮ

### *Чаму не хочацца ісці на вечар?*

*У нас, ва універсітэце, часта праводзяцца вечары адпачынку. І гэта вельмі добра. Кепска іншае: шмат каму са студэнтаў ісці на гэтыя вечары не хочацца. Чаму? Пасля ўрачыстай часткі і канцэрта мастацкай самадзейнасці звычайна пачынаюцца танцы. Аркестр іграе добра, няма чаго казаць. Але збіраецца на танцы тысяча ці больш чалавек і ўсе таўкуцца на адным чацвёртым паверсе. Яблыку няма дзе ўпасці, людзі стаяць ушчыльную адзін ля аднаго. Не тое, каб танцаваць, — нават прайсці цяжка. Таўкатня незвычайная, гарачыня невыносная.*

*Адказныя, калі яны і бываюць на вечары, амаль не ўплываюць на ход адпачынку. А хіба цяжка было б развесці людзей на два паверхі — яшчэ на трэці ці пяты? На адным іграў бы аркестр, на другім — радыёла. І больш ахвотна ішлі б на танцы студэнты.*

*Не варта, дарэчы, забывацца і на нас, вячэрнікаў. Некаторую частку запрашальных білетаў трэба даваць і нам. Пакуль жа вячэрнікам амаль немагчыма трапіць на вечар адпачынку.*

*Мне здаецца, што пытанне, якое я тут узняў, — не дробязь, і адказным за культурна-масавую работу ва універсітэце варта было б прыслухацца да заўваг.*

М. ВЯРШЫНІН,
студэнт 1-га курса вячэрняга аддз. гісторыі, інжынер-канструктар аддзела галоўнага тэхнолага Мінскага электратэхнічнага завода.

## Роздум пасля сходу

1.

Пачатак зімы сёлета выдаўся цёплы, роўны. У той вечар 22-га снежня пасля партсходу мы ішлі па праспекце. Насустрач дыхаў густы і цёплы вецер. Мой спадарожнік, малады камуніст, студэнт другога курса, з захапленнем ловячы на далонь пушыстыя сняжынкі, думаў услых:

— Заўтра пачне прыбываць дзень. Але ўсё роўна нават у чэрвені ён будзе такі кароткі! Новыя справы, новыя даручэнні. Часу заўсёды не хапае. Здараецца, што не хапае на галоўнае...

Ён гаворыць пра тое, што хвалюе многіх студэнтаў-камуністаў. Яны прыходзяць ва універсітэт хто ад станка, хто з салдацкага паста. Тут іх чакаюць зусім новыя абавязкі, па-новаму складаецца іх жыццё, побыт. Зусім не проста знайсці сябе, сваё месца ў новых абставінах. Здараецца, хто-небудзь з іх замкнецца ў сабе, прыглядаецца, пакутліва думае: «Ці спраўлюся? Многае забыта, на лекцыях не заўсёды ўсё зразумела». Такіх нямнога. Часцей бывае так: камуніст-першакурснік атрымлівае некалькі даручэнняў, пачынае мітусіцца, бегаць. Вопыту грамадскай работы ў новых абставінах няма, губляюцца дні, тыдні, месяцы, а поспехі мізэрныя. Тут бы старэйшым камуністам дапамагчы, параіць, падтрымаць, але не заўсёды так бывае.

Семестр прайшоў у мітусні, і нечакана набегла сесія. Не заўсёды студэнту-камуністу ўдаецца з ёй шчасліва разлічыцца. Адна, другая няўдача на экзаменах, і часам здараецца, што малады камуніст ужо ў другім семестры губляе цікавасць да грамадскай работы, спрабуе вызваліцца ад партыйных даручэнняў, «забываецца» на іх. Так зараджаюцца інертныя адносіны да жыцця партыйнай арганізацыі. А там — пасыпаліся папрокі і «праработкі», маўляў, камуніст, а вучышся слаба...

Трэба сур'ёзна падумаць пра тое, каб з першых дзён навучання маладога камуніста ва універсітэце ведаць узровень яго падрыхтоўкі, яго асабістыя схільнасці. Адна справа — даць маладому камуністу даручэнне, а другая — вучыць яго весці грамадскую работу, дапамагаць яму. Трэба з асаблівай увагай рэгламентаваць час студэнта-камуніста.

Першаступенным клопатам партыйных арганізацый павінна стаць вучоба маладых камуністаў. Без гэтага не можа быць размовы пра павышэнне іх ідэйных і дзелавых якасцей.

У той вечар я гаварыў з многімі студэнтамі-камуністамі. У кожным іх слове адчувалася адказнасць за даручаную партыйнай арганізацыяй справу, маладая энергія, усведамленне свайго абавязку. Але яны з хваляваннем гаварылі і пра тое, што і ў выніку іх уласнай нявопытнасці, і ў выніку «абкатных» (не выпадкова з'явілася на свет такое слова!) пасяджэнняў і «шумім-звонім» мерапрыемстваў марнуецца многа часу, які трэба было б аддаць бібліятэцы, кнізе, вучобе.

— Нам сорамна, — гаварылі некаторыя з іх, — але пакуль што мы ў сваёй групе не паказваем прыкладных поспехаў у вучобе. Пра нашу паспяховасць успамінаюць толькі тады, калі на партсходзе падводзяцца вынікі сесіі.

На вялікі жаль, гэта праўда. Тут ёсць над чым падумаць.

2.

Роздум пасля партыйнага сходу... Магчыма хто-небудзь скажа: «Бярэцца чалавек пасля дажынак снапы вязаць». Але я думаю, што сапраўды партыйны сход — гэта толькі пачатак і добрых спраў, і добрых змен у шматгранным жыцці калектыву. Ён падкрэсліў узрастаючую ролю і адказнасць партыйных арганізацый за работу факультэцкіх калектываў.

У перадавым артыкуле «Праўды» ад 23 снежня 1964 года адзначаецца, што «ўзмацненне кіруючай ролі партыі і яе мясцовых органаў — аб'ектыўная заканамернасць і неад'емная рыса ўсяго жыцця і дзейнасці нашай агульнанароднай дзяржавы».

Але нельга думаць, што роля партыйных арганізацый будзе павышацца сама па сабе. Поспех партыйнага калектыву будзе залежаць перш за ўсё ад таго, наколькі актыўна будзе працаваць кожны камуніст. Разам з тым вельмі важна вызваліць партыйныя арганізацыі і партыйныя бюро факультэтаў ад дробнай адміністрацыйнай апекі, ад навязвання ім па спешлівых адміністрацыйных пастаноў і загадаў. Трэба назаўсёды пакончыць нават з асобнымі фактамі заганнай практыкі, калі пра меры, пастановы і загады адміністрацыі, якія непасрэдна датычацца жыцця факультэтаў партыйныя бюро даведваюцца пасля іх прыняцця, калі адміністрацыя ставіць партыйнае бюро перад звершаным фактам, перад увайшоўшым у сілу загадам. Трэба больш паважаць ініцыятыву, калектыўны вопыт і думку партыйных органаў. Гутарка ідзе не пра бюракратычную субардынацыю, не пра «праўдзенне» справы па інстанцыях. Гутарка ідзе пра прынцыповае і дзейснае спалучэнне намаганняў партыйных і адміністрацыйных органаў, пра тактоўныя адносіны да калектыўнай думкі партыйнай арганізацыі, а ў выніку і пра павышэнне яе ролі і актыўнасці. У гэтыя дні, калі наша партыя з надзвычайнай увагай ставіцца да запатрабаванняў жыцця і рашуча адкідае заганныя праявы адміністрацыйнага свербу, папяровага руху і званарства, нам шмат у чым трэба перагледзець свой стыль работы.

І тут, відаць, прыйшла чарга канкрэтных фактаў.

30 лістапада партыйнае бюро фізічнага факультэта разглядала персанальную справу маладога камуніста. Члены бюро сустрэліся з дзіўным становішчам. Ім стала вядома, што да пасяджэння партбюро справа разглядалася на рэктараце і было прынята адпаведнае рашэнне. Адзін з прысутных таварышаў зазначыў, што членам бюро абмяркоўваць няма чаго, паколькі рашэнне ўжо ёсць. «Але ж як тут быць? — адказалі яму. — Камуніст, які дапусціў нядобры ўчынак, — член нашай арганізацыі, і разглядаць яго персанальную справу — гэта перш за ўсё наш абавязак і наша права!»

Члены бюро фізфака паступілі правільна, што дэталёва і прынцыпова разгледзелі ўсе «за» і «супраць» і вызначылі для маладога камуніста сваю меру партыйнага спагнання. Трэба сказаць, што і рэктарат разумна падыйшоў да рашэння партбюро і перагледзеў сваё паспешлівае рашэнне.

Адзначу і некаторыя іншыя факты, якія сведчаць, што адміністрацыйная паспешлівасць і фармальныя адносіны да погляду партыйнага калектыву нікому не прыносяць карысці.

У 1963 годзе выконваючым абавязкі дэкана геаграфічнага факультэта быў прызначан Д. М. Карулін. У хуткім часе ён праявіў празмерную схільнасць да адміні-

(Заканчэнне на 2 стар.)

# Роздум пасля сходу

(Пачатак на 1 стар.)

стравання, не лічыў патрэбным раіцца з партыйным бюро пры вырашэнні некаторых прынцыповых пытанняў. Так, адным загадам тав. Карулін накіраваў маладога выкладчыка-камуніста з групай студэнтаў на ўборку бульбы, а другім — вынес яму вымову за тое, што выкладчык у той жа самы час не з'явіўся на лекцыю. І ў гэтым выпадку тав. Карулін вызначыў спагнанне камуністу ў абход партбюро факультэта.

3-га снежня партыйнае бюро геаграфічнага факультэта разглядала пытанне аб уходзе дэкана М. Т. Раманоўскага ў адпачынак і аб прызначэнні Д. М. Каруліна выконваючым абавязкі дэкана. Што ж, магчыма тав. Карулін улічыў свае памылкі, і партыйнае бюро ў гэтых адносінах павінна было сказаць сваё слова. Але і на гэты раз партыйнаму бюро навязваўся фармальны падыход да пытання, паколькі члены бюро былі папярэджаны, што ў адміністрацыйным парадку гэтая справа ўжо вырашана. Партбюро недвухсэнсоўна адзначыла, што тав. Карулін «як адміністратар нетактоўны, грубы, натурысты» і што выкарыстанне яго на гэтай пасадзе лічыць немэтазгодным.

Падкрэсліваю, што я ні ў якім разе не думаю прыніжаць ролю і аўтарытэт адміністрацыі. Кожны камуніст і партыйная арганізацыя ў цэлым працуюць у прынцыповай садружнасці з кіраўнікамі-адміністратарамі. Партыя перасцерагае мясцовыя партыйныя органы ад падмены адміністрацыйных і гаспадарчых органаў. Разам з тым, чым больш уважліва будзе ставіцца адміністрацыя да калектыўнай думкі партыйнага органа, тым вышэй будзе яе аўтарытэт, тым большай будзе гарантыя ад памылак, тым больш трывалымі будуць асновы поспехаў і дасягненняў у нашым паўсядзённым жыцці.

Р. САЛАДУХА.

# Прыгоды Мяк... Падмазоўскаг...

(Пачатак гл. у № 33 за 1964 г. і ў № 1 з 1965 г.).

3.

Завяршылася бульбяная кампанія, адшумела, адгрымела на сходах літаўравае праслаўленне тых, хто на бульбяным полі высока трымаў гонар універсітэта, а папросту сказаць, працаваў, як павінен працаваць кожны чалавек. Адсыпаліся і забыліся вымовы і папярэджанні тым, хто з году ў год «хварэе» якраз у бульбяны сезон. Мякішу можна было пакідаць хор, бо ён добра разумеў, што з пасады радавога харыста ніхто яшчэ не распачынаў сапраўднай кар'еры. Але яго вельмі зацікавіў харавы маэстра Платон Загадавіч Пеўчаноўскі.

Дзіўны гэты быў чалавек. Даўно ўжо было адсвяткавана яго шасцідзесяцігоддзе, калі ў добраахвотна-абавязковым парадку сярод харыстаў і не-харыстаў сабралі па рубліку на падарункі Платону Загадавічу. Давалі ўсе, бо спадзяваліся, што ён пойдзе на пенсію і на радасць калектыву знойдзе свой спакой, з якога і пачнецца магчымасць спакойнай і плённай працы для былых яго падначаленых. Але ахвяры на падарункі маэстра прыняў за высокую ацэнку яго дзейнасці і вырашыў застацца яшчэ на год-другі, каб пасля мець магчымасць гаварыць пра слаўнае дзесяцігоддзе ў жыцці харавога калектыву. А тым часам, вядома кожнаму студэнту, харавая капэла распадалася і мізарнела. «Ну і што ж, — гаварылі некаторыя. — Затое мы маем праслаўленага маэстра. Адны яго званні чаго вартыя!». І сапраўды, яны мелі рацыю.

Платон Загадавіч быў членам розных камісій і падкамісій, журы і саветаў, камітэтаў і калегій, дэлегацый і прадстаўніцтваў. Казалі нават, што ён узначальваў нейкую лабараторыю па праблемах знешне-зрокавага афармлення гукаў і хору. І ці быў ён вінаваты, што не меў часу працаваць?! Няхай дзякуюць і за тое, што ён, застаючыся без выхадных, цярпліва адседжваў у прэзідыумах пасяджэнняў усіх гэтых устаноў і арганізацый.

Іван КАЗАЧНІК.

(Заканчэнне будзе)

Творчасць „узлётаўцаў“

# Хведар ЧЭРНЯ

## Адэскія катакомбы

*Чуваць, як з мора дыхаюць пасаты,*
*І лёгка дыхаць морам і зямлёй.*
*А Юра першы з фотаапаратам*
*Знікае ў таямнічасці нямой.*

*Ноч. Цемрыва. Як мёд, густая вільгаць*
*На вуснах асядае, на павеках.*
*І моцна пахне першабытнай цвіллю,*
*Як у пячэрах Ноявага веку.*

*Запальваю паходню і, як Данка*
*З гарачым сэрцам, крочу я па сцежцы,*
*І страшны вір падзей, трывог нядаўніх*
*Мы бачым на экранах нашых сэрцаў.*

*І ўжо не можа цемрыва маўчаць:*
*Іменамі, якіх агнём не сцерці,*
*Сівыя сцены праз вякі крычаць*
*Аб іхняй смерці і аб іх бяссмерці.*

*Не, ў мора не хапіла б і вады,*
*У небе не хапіла б і паветра,*
*Каб вораг мог заліць усе хады,*
*Каб дымам задушыць прытулак верны.*

*Тут кожны камень быў шчытом салдата,*
*І каменя цвярдзейшы быў салдат...*
*Апошнім самым з фотаапаратам*
*Наш Юра паспяшаецца назад.*

*Якая цішыня! Якое сонца ў нас!*
*А грудзі болем і адчаем поўняцца.*
*І мы стаім, забыўшыся пра час,*
*Як перад самым неўміручым помнікам!*

## Сапун-гара

*Казалі, што татары на валах*
*Цераз яе перапраўлялі соль.*
*І, мусіць, мала памагаў алах:*
*Сон гаспадар і вол таксама сон.*

*І адсаплі: ні солі, ні валоў.*
*І я б тым не думаю ўсур'ёз.*
*Гэта не ёй, мінуўшчыне сівой,*
*Гранітны помнік у блакіт урос.*

*Сорак другі. Вайна. Тут смерці*
*круг.*
*Нібы пятлю, зацягвала браня.*
*І «тыгры» ўгрызаліся ў гару,*
*Нібы хацелі з морам параўняць.*

*Цякла мерыдыянамі траншэй*
*У мора перамешаная кроў,*
*І ўся гара ўзнімалася вышэй*
*Ад мёртвых цел, наваленых гарой.*

*І дзесяць год даказвалі адны,*
*Што сад не ўстане на касцях*
*вайны,*
*А сад шуміць. Здаецца, шэпча сад*
*Басамі тых, загінуўшых, салдат.*

*Здаецца, па артэрыях ствалоў,*
*Цераз спляценне маладых галін*
*Спяшае сонца ласку і цяпло*
*Аддаць для тых, якія ў зямлі...*

*Сапун-гара! Тут цяжка гаварыць...*
*Тут кожны камень хоча*
*гаварыць!..*

## Дарога ў Феадосію

*Вышэй і вышэй, нібы к д'яблу на рогі,*
*Узносіць газон прад сабой дарогу.*
*А потым уніз і ўніз наўздагон*
*Той жа дарозе ляціць газон.*

*І Вася — шафёр наш — крымскі ас.*
*Над выступамі, над кручамі*
*На кожнай вярсце па сотню раз*
*Баранку ў руках перакручвае.*

*І нас, да рамантыкі прагных філолагаў,*
*Захутваюць шчыльна ў плашчы вятры.*
*А сонца то выскачыць з-за гары,*
*То нырне ў туманаў бялёсае логава*

*І вышэй, вышэй альпіністам лоўкім*
*Узбіраецца на вяршыню дня.*
*І здаецца, вось-вось, нагрэўшыся, лопне*
*Нябёс люстраных чысціня.*

*Але на мёртвай вышэйшай кропцы*
*Ламаюцца доўгія промні сонца,*
*І, абяссілеўшы, падае ўніз,*
*Дзе мора тысячай хваль звініць,*

*Дзе Айвазоўскі на схіле гары*
*Стаіць і глядзіць на стыхію...*
*Разбіваюцца ўшчэнт аб грудзі вятры —*
*Краявіды смакуюць хімікі.*

## На „Абхазіі“

*Мы, здаецца, у зорным свеце:*
*Зоры зверху і зоры знізу.*
*І на след свой пеністы, светлы*
*Іх «Абхазія» ніжа.*
*Дзьмуць вятры, і ні чым не*
*сагрэешся.*
*(Мы на палубе, разам з чайкамі).*
*А ў каютах, напэўна, старэйшыя:*
*Можа там якія начальнікі?*

*Толькі зайздрасць нікога не мучае:*
*З намі — песні, з намі — музыка,*
*І ляціць да ўсіх прычалаў:*
*«Нас качала, з табой, качала!»*
*А калі развітаюся з Людкай,*
*І баян пазяхне мой смачна,*
*Я палезу наверх, у шлюпку,*
*Каб да чаек бліжэй, да мачтаў.*
*Там унізе пеніцца мора,*

*У каютах спакусы камфорта,*
*Я ж вазьму ў абдымкі зоры,*
*Я пачую дыханне Басфора.*
*І, накрыўшыся шляхам Млечным,*
*Я адчую, паспеўшы праспацца,*
*Як вятры стануць тузаць за*
*плечы...*
*Пэўна, сны не пра мора*
*прысняцца!*

* * *

*Мора, як ты, вольнае і неспакойнае —*
*Грыміць*
*і звоніць на струнах хваль.*
*І ты, як мора,*
*задумлівая і непакорлівая —*
*Вырываешся з рук*
*і ляціш удаль.*
*Але ты не мора.*
*Ты — нешта вялікае,*
*Гордае і непадобнае кожны міг.*
*І мора зусім бяссільнае. —*
*Просіць цябе і кліча*
*Прыйсці да яго,*
*каб прыпасці да ног тваіх.*
*І ты згаджаешся.*
*Весела крочыш па беразе*
*І ўсмешку на вуснах мокрых нясеш.*
*А белая блузка*
*здаецца маленькім ветразем,*
*І, здаецца, пад ім ты насустрач мору плывеш.*
*Гараць ля берага пырскі каралямі,*
*І хвалі прыносяць мне неспакой:*
*А раптам станеш ты лёгкім караблікам*
*І растанеш у сіні марской?!*



Студэнты універсітэта на лыжнай прагулцы.
Фота А. Міханава.

# Р. Д. ГАЙДУК

Пасля цяжкай хваробы заўчасна, ва ўзросце 54 год памёр выкладчык кафедры крымінальнага права і працэсу палкоўнік юстыцыі ў адстаўцы Гайдук Рыгор Данілавіч. Смерць вырвала з нашых радоў кваліфікаванага выкладчыка, які меў багаты вопыт работы ў органах юстыцыі, клапатлівага, разумнага, патрабавальнага выхаваўцу студэнцтва.

25 гадоў працаваў Рыгор Данілавіч у органах ваеннай юстыцыі, у гэтыя гады ён усе свае сілы і веды аддаваў справе ўмацавання сацыялістычнай законнасці і воінскай дысцыпліны.

У сувязі з хваробай Рыгору Данілавічу прыйшлося пакінуць любімую работу ваеннага юрыста і пайсці на пенсію. Але ён адразу ж, з 1961 года, уключыўся ў выкладчыцкую работу на юрыдычным факультэце нашага універсітэта. Высокая патрабавальнасць да сябе і да іншых, вялікая любоў да працы, выключная добрасумленнасць у выкананні сваіх службовых і грамадскіх абавязкаў, чуласць — усё гэта выклікала павагу і любоў да Р. Д. Гайдука з боку тых, хто працаваў побач з ім на юрыдычным факультэце.

Усё жыццё Р. Д. Гайдук турбаваўся аб павышэнні сваёй кваліфікацыі, аб паглыбленні ведаў. У 1934 г. ён скончыў Інстытут савецкага будаўніцтва і права, у 1949 г. — вячэрні універсітэт марксізма-ленінізма, у 1953 г. — вышэйшыя акадэмічныя курсы пры Ваеннай юрыдычнай акадэміі. Працуючы на юрыдычным факультэце, Р. Д. Гайдук здаў кандыдацкія экзамены і паспяхова працаваў над кандыдацкай дысертацыяй.

Р. Д. Гайдук вёў вялікую грамадскую работу, ён неаднаразова выбіраўся ў склад прафсаюзнага бюро факультэта, выконваў пастаяннае партыйнае даручэнне па правядзенню выхаваўчай работы ў студэнцкім інтэрнаце.

За мужнасць і гераізм у час Вялікай Айчыннай вайны Р. Д. Гайдук узнагароджан дзвюма ордэнамі Чырвонага Сцяга, дзвюма ордэнамі Чырвонай Зоркі, ордэнам Айчыннай вайны I ступені і пяццю медалямі.

Памяць аб Р. Д. Гайдуку назаўсёды застанецца ў нашых сэрцах.

ГРУПА ТАВАРЫШАЎ.

Калектыў філалагічнага факультэта выказвае глыбокае спачуванне кандыдату філалагічных навук, выкладчыцы кафедры тэорыі і практыкі партыйна-савецкага друку СНІЦАРАВАЙ Ніне Аляксандраўне з выпадку напаткаўшага яе гора — смерці бацькі.

Рэдактар П. СІЛІВАНЧЫК.

Адрас рэдакцыі:
г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, 212. Тэл. 2-07-19.

Друкарня Белсаўпрофа.
АТ 00723. Тыр. 2000 Зак. 303.